ВІЦЕБСКАЯ ВОБЛАСЦЬ (/BE/GEO/18) 2151

На глыбоцкага журналіста склалі чарговы пратакол за прафесійную дзейнасць

08.02.2019 Крыніца: Служба маніторынгу ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў"

Сюжэт: 23.5 КаАП (/be/content/235-kaap)

Журналіст-фрылансер з Глыбокага Зміцер Лупач 8 лютага атрымаў позву ў Глыбоцкі РАУС. Яе даслаў капітан міліцыі, старшы інспектар па дазвольнай рабоце аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі Сяргей Цырбан.



Гэты міліцыянт пастаянна перасследуе незалежнага журналіста: спачатку Цырбан патэлефанаваў Змітру зранку, каб ён з’явіўся ў РАУС, потым даслаў позву на Viber.

У аддзяленні міліцыі Сяргей Цырбан склаў на Змітра Лупача пратакол. У ім міліцыянт зноў вінаваціць журналіста ў парушэнні артыкула 35 “Закона аб СМІ” (працы без акрэдытацыі) і прыцягвае да адказнасці паводле часткі 2 артыкула 22.9 КаАП (незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі СМІ).

Як кажа Зміцер Лупач, ён не ведае, Сяргей Цырбан перасследуе яго з уласнай ініцыятывы ці выконвае чыйсці загад зверху. Але перакананы, што пераслед незалежных журналістаў працягваецца і наўрадці скончыцца.

“Наколькі я памятаю, паслабленняў ніякіх не было, толькі ўзмацняўся ціск на незалежных журналістаў. Праўда, трэба заўважыць, што ў 2016 годзе, калі кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка сказаў не пераследваць журналістаў, па нейкіх там сваіх інтарэсах, год гэта пратрывала. Але не ўсюды, напрыклад, у Гомелі і ў той час не перасталі прыцягваць да адміністрацыйнай адказнасці журналістаў-фрылансераў за прафесійную дзейнасць, – зазначае зміцер Лупач. – Таму спадзяванняў на змены да лепшага няма. Тым больш у хуткім часе нас чакаюць парламенцкія і прэзідэнцкія выбары”.

Сёлета на Змітра Лупача быў складзены першы пратакол. На гэты раз падставай для прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці стаў сюжэт на спадарожнікавым тэлеканале “Белсат” пад назвай “На Віцебшчыне паставілі помнік камсамолу”.

Летась незалежны журналіст па артыкуле 22.9 КаАП прыцягваўся да адказнасці дзевяць разоў. Агулам ён сплаціў штрафаў на суму 4 802 беларускія рубл[illegible]

Самыя важныя навіны і матэрыялы ў нашым Тэлеграм-канале — падпісвайцеся! (https://t.me/bajby)

Найбольш чытанае

Коллеги в тюрьмах. Напишите им письмо поддержки АКТУАЛЬНЫЕ АДРЕСА (/be/content/kollegi-v-tyurmah-napishite-im-pismo-podderzhki-aktualnye-adresa)

Ідзе прыём матэрыялаў на конкурс «Вольнае слова» (да 1 траўня) (/be/content/idze-pryyom-materyyalau-na-konkurs-volnae-slova-da-1-traunya)

У Варшаве пачаліся здымкі поўнаметражнай карціны «8 гадоў 3 месяцы». Яна натхнёная гісторыяй кахання Кацярыны Андрэевай і Ігара Ільяша (/be/content/u-varshave-pachalisya-zdymki-pounametrazhnay-karciny-8-gadou-3-mesyacy-yana-nathnyonaya)

Прафесійны фактчэк-марафон «Давярай, але правярай!» (рэгістрацыя да 18 красавіка) (/be/content/prafesiyny-faktchek-marafon-davyaray-ale-pravyaray-registracyya-da-18-krasavika)

Сюжэты (/stories)

COVID-19 (/be/content/covid-19)

Аўтарскія калонкі (/blogs)

Анна Ефременко, белорусского


23.5 КаАП (/be/content/235-kaap)

Рэгуляванне Байнэту (/be/content/regulyavanne-baynetu-0)

Распаўсюд СМІ (/be/content/raspausyud-smi)

языка в моей жизни за пределами стерильных рамок уроков не было вовсе (/be/content/anna-efremenko-belorusskogo-yazyka-v-moey-zhizni-za-predelami-sterilnyh-ramok-urokov-ne-bylo)

Спецпраекты (/analytics/27)



(/be/analytics/natasha-hamutovskaya-ya-polevoy-zhurnalist-gotova-idti-nochyu-po-bolotu-peresazhivatsya-s)

Наташа Хамутовская: Я «полевой» журналист. Готова идти ночью по болоту, пересаж[illegible]ваться

Важнае



(/be/analytics/shto-matyvue-udzelnichac-u-bazhnym-zhycci-infagrafika)

Што матывуе ўдзельнічаць у “БАЖным” жыцці? (Інфаграфіка) (/be/analytics/shto-matyvue-udzelnichac-u-bazhnym-zhycci-infagrafika)

с электрички на коня! (/be/analytics/natasha-hamutovskaya-ya-polevoy-zhurnalist-gotova-idti-nochyu-po-bolotu-peresazhivatsya-s)



(/be/content/freedom-house-belarus-u-dzyasyatcy-naygorshyh-krain-pa-svabodze-slova)

Freedom House: Беларусь – у дзясятцы найгоршых краін па свабодзе слова (/be/content/freedom-house-belarus-u-dzyasyatcy-naygorshyh-krain-pa-svabodze-slova)



(/be/analytics/zakratavany-yubiley-pra-gonar-byc-syabram-i-kalegam-andreya-alyaksandrava)

Закратаваны юбілей. Пра гонар быць сябрам і калегам Андрэя Аляксандрава (/be/analytics/zakratavany-yubiley-pra-gonar-byc-syabram-i-kalegam-

andreya-alyaksandrava)

*Беларуская асацыяцыя журналістаў

Copyright © 2008-2023 Беларуская асацыяцыя журналістаў

e-mail: press@baj.by (mailto:press@baj.by)
Рэдакцыйная палітыка сайта (/be/editorial_policy)